# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (1020) ● СУБОТА, 1 верасня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII



## ПРАЦАВАЦЬ—СТАРАННА, ЗАЙМАЦЦА—НАСТОЙЛІВА

**У. М. СІКОРСКІ,**
**рэктар БДУ, член-карэспандэнт АН БССР.**

Сёння наш універсітэт — старэйшая ВНУ рэспублікі — пачынае свой пяцьдзесят другі навучальны год. Амаль дзесяць тысяч юнакоў і дзяўчат запоўняць прасторныя аўдыторыі і лабараторыі; пройдуць урачыстыя, заўсёды хвалюючыя хвіліны першага званка і пачнуцца звычайныя студэнцкія будні. Адначасова да заняткаў прыступяць больш васьмі тысяч вячэрнікаў і завочнікаў, якія атрымліваюць універсітэцкую адукацыю без адрыву ад вытворчасці.

Па-рознаму адкладзецца гэты год у вашых студэнцкіх лёсах. Для першакурснікаў — гэта ўсяго толькі пачатак шляху ўзыходжання да ведаў, шляху нялёгкага, цярністага, які быў такім жаданым і які стаў цяпер рэальнасцю. Для універсітэцкіх «старажылаў», якія працягваюць вучобу, — гэта год далейшага паглыблення ў сваю спецыяльнасць, абагачэння ўменнямі і навыкамі, уключэння ў самастойны навуковы пошук, год новых цікавых і разнастайных студэнцкіх спраў. Нарэшце, для выпускнікоў — гэта год падвядзення вынікаў, справаздачы перад сваім калектывам, перад Радзімай за праведзенае ў сценах універсітэта пяцігоддзе, за якім пачынаецца высакародная праца на карысць нашага грамадства, адкрыўшага для моладзі ўсе шляхі, стварыўшага ўсе ўмовы для далучэння да вышынь навукі і культуры.

Сённяшні год для нашай краіны — гэта трэці, рашаючы год дзевятай пяцігодкі, год напружанай працы савецкага народа, яго гераічнай барацьбы за ажыццяўленне рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Новабудоўлі рэспублікі і сельскія школы, калгасныя нівы і навукова-даследчыя лабараторыі — усе галіны народнай гаспадаркі і культуры чакаюць высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных паспяхова рашаць складаныя задачы стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму і выхавання новых пакаленняў высокасвядомых і высокаадукаваных грамадзян. Шматлікая армія такіх спецыялістаў выйдзе і са сцен БДУ.

І таму кім бы ты ні быў заўтра — педагогам або інжынерам, тэхнолагам або юрыстам, вучоным або журналістам, — сёння твой галоўны доўг, твой галоўны ўклад у пяцігодку — авалоданне ведамі, усебаковая падрыхтоўка да заўтрашняй работы. Сёння ты студэнт, а гэтае старажытнае лацінскае слова ў перакладзе азначае **старанна працуючы.** Менавіта гэтай стараннасці, настойлівасці, упартасці ў авалоданні ведамі перш за ўсё і хочацца пажадаць сёння ўсім вам, хто ўдастоен высокага і ганаровага звання студэнта універсітэта, які носіць імя вялікага Леніна.

Вядома, што ў нашу эпоху— эпоху вялікіх сацыяльных перамен, пераходу ад капіталізму да сацыялізму і камунізму, у век найглыбейшай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, быць добрым спецыялістам нялёгка. Ім нельга стаць, працуючы толькі ў паўсілы, спадзеючыся на «шчаслівы» білет на экзамене.

Савецкі спецыяліст любой галіны ведаў абавязан глыбока авалодаць марксісцка-ленінскім вучэннем, ясна ўсведамляць канчатковыя мэты партыі і краіны і актыўна змагацца за іх ажыццяўленне. Ён павінен мець шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодаць сваёй спецыяльнасцю. Савецкі спецыяліст абавязан быць добрым арганізатарам вытворчасці, здольным на практыцы прымяняць прынцыпы навуковай арганізацыі працы, умець працаваць з людзьмі, прыслухоўвацца да думкі таварышаў, крытычна ацэньваць дасягнутае. Савецкага спецыяліста цяжка ўявіць без высокай культуры, шырокай эрудыцыі.

Вы, сённяшнія студэнты, павінны ўступіць у жыццё пасля заканчэння БДУ спецыялістамі, якія адпавядаюць гэтым высокім патрабаванням. У вас ёсць усё неабходнае для таго, каб стаць такімі спецыялістамі.

Дык за вучобу, таварышы!

Віншую вас з новым навучальным годам і жадаю вялікіх поспехаў і вялікага шчасця!

## ЗА СПРАВЫ З ПЕРШАГА ДНЯ!

У нашай камсамольскай сям'і з'явілася амаль дзве тысячы новых членаў. Сёння яны першакурснікі, але пройдзе зусім нямнога часу, і на іх плечы пяройдзе ўвесь цяжар грамадскай работы.

Звычайна першакурснікі не задумваюцца над тым, што ім патрэбна будзе не толькі вучыцца. Зразумела, па веданне грамадскай працы экзамен здаваць не патрэбна. Але кожны з іх, пэўна, ужо чуў пра студэнцкія будаўнічыя атрады, сустракаўся з выпускнікамі і студэнтамі універсітэта, якія выступалі перад школьнікамі з лекцыямі, канцэртамі мастацкай самадзейнасці. Гэта — праца універсітэцкай моладзі, якую нельга вымяраць баламі, але якая мае вялікае грамадскае значэнне. Вось чаму з першага дня вучобы кожны першакурснік павінен выбраць сабе справу па сэрцу, успомніць тыя пажаданні, якія былі выказаны ў гутарках з дэканамі, сакратарамі камітэтаў камсамола. членамі грамадскай прыёмнай камісіі. Трэба ўспомніць пра свае намеры актыўна займацца камсамольскай работай, працягваць заняткі спортам, мастацкай самадзейнасцю.

Вопыт паказвае, што першакурснікі з нейкай баязлівасцю адносяцца да грамадскай работы, а часам і выказваюць меркаванні, што яна перашкаджае паспяховай вучобе. Гэта зусім няправільна. Грамадская работа дапаможа першакурсніку хутчэй пазнаць рытм жыцця універсітэта і лягчэй увайсці ў яго, да таго ж, актыўная грамадская работа дае чалавеку веданне спецыфікі працы ў калектыве, навыкі валодання аўдыторыяй. У нас ёсць факты, калі студэнты, далёкія ад грамадскай работы, адчувалі сябе разгубленымі, нават працуючы па спецыяльнасці. Каб гэтага не здарылася, трэба смялей далучацца да камсамольскага жыцця універсітэта.

Камітэт камсамола універсітэта віншуе першакурснікаў з пачаткам навучальнага года, з пачаткам вялікага шляху ў сталае жыццё!

**А. СЛУКА,**
сакратар камітэта камсамола універсітэта.







* Экзаменацыйныя выпрабаванні...

* Адказ абітурыенткі па гісторыі разам з экзаменатарам дацэнтам В. Н. Рабцэвічам слухаюць дэкан гістфака І. О. Царук, рэктар БДУ У. М. Сікорскі, сакратар Мінскага гаркома КПБ Т. Ц. Дзмітрыева.

* Экзамен па геаграфіі прымаюць кандыдат навук В Г. Сінякова і ст. выкладчык М. А. Майракаў.

Фота Д. Прэса.

# ЯНЫ СТАЛІ СТУДЭНТАМІ

— Шчаслівчыкі! Ужо студэнты.

— Ім лягчэй. Яны — медалісты.

**(З размовы двух абітурыентаў).**

Уступныя экзамены яшчэ працягваюцца. Гэтак жа мераюць крокамі універсітэцкі дворык усхваляваныя таты і мамы, і гучны радасны воклiч «пяць» прымушае іх раптам уздрыгваць і бегчы абдымаць сваё любімае дзіця. Гэтак жа нецярпліва закідваюць адзін аднаго пытаннямі хлопцы і дзяўчаты з вялікага племя абітурыентаў: «А табе што папалася? Дадатковыя задаюць?»

Для гэтых дзяўчат і юнакоў усе экзаменацыйныя хваляванні — ужо мінулае. Здаўшыя на выдатна гісторыю СССР Таня Сурта, Віктар Старавойтаў, Хасан Шаманаў, Сяргей Кубасаў, Ніна Заікіна і іншыя залічаны на першы курс юрыдычнага факультэта. Іх сярэдні ўзрост — 18 год. Прыехалі сюды з розных куткоў Беларусі, а Хасан Шаманаў — з Паўночнага Каўказа.

На маё запытанне, чаму выбраў іменна Мінск, адказвае:

— У арміі сябраваў з хлопцамі - беларусамі. Яны многа расказвалі пра сваю рэспубліку, запрашалі ў госці.

Віктар Старавойтаў яшчэ ў школе цвёрда ведаў: буду пракурорам, як бацька. Вольга Віткіна таксама вырашыла працягваць справу бацькі. Ну, а як іншыя? Чаму яны прыйшлі на юрыдычны факультэт?

**Пётр Сцепанчук, скончыў сярэднюю школу ў Гродзенскай вобласці.**

— Я шмат глядзеў фільмаў і чытаў кніг пра работнікаў міліцыі, следчых. Яны захапілі мяне.

**Тамара Рабцава, г. Мінск.**

— Мой жыццёвы ідэал — Уладзімір Ільіч Ленін. А ён скончыў юрыдычны. І потым, вельмі люблю працаваць з людзьмі.

**Сяргей Кубасаў, г. Валожын.**

— Ёсць у абранай мною прафесіі нейкая прыцягваючая сіла.

**Люда Федаркевіч, Брэсцкая вобласць.**

— Люблю, калі людзі гавораць толькі праўду. І хачу змагацца за яе.

Дык ці было ім лягчэй за іншых?

Ніна Заікіна лічыць, што зусім наадварот. Атрымаўшы залаты медаль, яны ўзялі на сябе вялікую адказнасць: даказаць, што атэстат асобага ўзору дастаўся ім па праву, абараніць гонар роднай школы.

Толькі што скончылася гутарка з медалістамі. Намеснік дэкана юрыдычнага факультэта Міхаіл Рыгоравіч Петачэнка шчыра віншаваў новых студэнтаў, жадаў ім поспехаў ў вучобе. А мне ўспомнілася адна заява аб допуску да экзаменаў, пра якую часта ўспамінаюць. У ёй у графе «Аб сабе дадаткова паведамляю» было напісана: вельмі хачу вучыцца. Можа гэта напісаў нехта з маіх новых знаёмых?

**Л. ПЕРАСЫПКІНА.**



*Жнівень быў гарачым не толькі для абітурыентаў. Напружана працавала прыёмная камісія. Увесь яе састаў прыкладаў нямала сіл і старанняў, каб паспяхова справіцца з мноствам неадкладных і адказных спраў.*

*На працягу дваццаці экзаменацыйных дзён мужнымі былі выкладчыкі, уважліва, цярпліва, тактоўна выслухоўваючы абітурыенцкія адказы.*

*І ўсё ж найбольш хваляванняў выпала на долю тых, хто імкнуўся стаць студэнтам. Вось як ловяць яны кожнае слова таварыша, ужо пераадолеўшага экзаменацыйны бар'ер.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

# НАРАЧАНСКІЯ КАНІКУЛЫ





**Пакуль ва універсітэцкіх аўдыторыях кіпелі экзаменацыйныя страсці і былыя школьнікі змагаліся за права заняць месца ў студэнцкай сям'і, на маляўнічай Нарачы весела адпачывалі, загартоўвалі здароўе, набіраліся сіл к новаму навучальнаму году студэнты розных факультэтаў БДУ.**

**Вось як праходзіла тут свята Няптуна.**

**Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.**



*Гэты здымак наш фотакарэспандэнт зрабіў напярэдадні ўступных экзаменаў у час кансультацыі на падрыхтоўчых курсах.*



# КЛОПАТЫ НЕ КАНЧАЮЦЦА

КОЖНЫ ГОД у жніўні сотні абітурыентаў пераступаюць парог БДУ. Многія з іх ужо даўно выбралі сваю будучую спецыяльнасць, але некаторыя прыходзяць ва універсітэт, яшчэ не вырашыўшы канчаткова, пайсці ў філолагі ці падацца на юрфак. Стаўшы студэнтамі, яны часта расчароўваюцца, пасрэдна вучацца.

Каб аблегчыць школьнікам выбар шляху, дапамагчы ім хутчэй сарыентавацца ва універсітэце, і створана грамадская прыёмная камісія (ГПК). Сваю дзейнасць яна разгортвае задоўга да уступных экзаменаў. Студэнты БДУ — частыя госці ў школах розных гарадоў і сёл Беларусі. Агітбрыгады факультэтаў, байцы СБА выязджаюць з лекцыямі аб універсітэце ва ўсе куткі рэспублікі.

Асабліва многа працы ў ГПК у перыяд уступных экзаменаў. Члены камісіі клапоцяцца аб забеспячэнні абітурыентаў жыллём, правядзенні кансультацый, арганізуюць праверкі інтэрнатаў, дзяжурства ў карпусах у час экзаменаў.

Вясной камітэт камсамола БДУ зацвердзіў спіс членаў ГПК. Сярод іх былі прадстаўнікі амаль усіх факультэтаў. У жніўні ў ГПК працавалі студэнты ФПМ, матфака, юрфака, хімфака, філфака. Адказным сакратаром ГПК была назначана студэнтка III курса ФПМ Людміла Рэдзькіна.

Наведвальнікамі грамадскай прыёмнай камісіі часта былі не толькі абітурыенты, але і іх бацькі. Сюды прыходзілі і з бедамі, і каб парадавацца разам выдатнай адзнацы, атрымаць кансультацыю. Змястоўныя кансультацыі па хіміі, матэматыцы давалі студэнткі Таня Галіцкая, Ларыса Аскера і іншыя члены ГПК.

Уступныя экзамены для многіх абітурыентаў былі першымі самастойнымі крокамі ў незнаёмым вялікім горадзе. І на дапамогу юнакам і дзяўчатам прыходзілі члены ГПК. Яны выдавалі накіраванні ў інтэрнаты (дарэчы, толькі за жнівень ГПК пасяліла ў інтэрнаты каля 900 чалавек). Акрамя таго, члены ГПК былі частымі гасцямі ў інтэрнатах. Яны імкнуліся да цеснага кантакту з абітурыентамі, сачылі за парадкам у інтэрнатах, давалі сяброўскія парады перад экзаменамі.

У час уступных экзаменаў БДУ наведала дэлегацыя чэхаславацкіх студэнтаў з горада Жыліна. Члены ГПК Таццяна Спіжанкова і Галіна Котлінская паказалі нашым гасцям універсітэцкі гарадок, правялі экскурсію па Мінску. Чэхаславацкія студэнты з вялікай цікавасцю выслухалі расказ аб жыцці беларускіх студэнтаў, аб дзейнасці ГПК. Вялікае ўражанне на нашых сяброў з ЧССР зрабілі лекцыйныя аўдыторыі і лабараторыі, вылічальны цэнтр БДУ.

Вельмі многа спраў у дні экзаменаў было на пошце. І гэты важны ўчастак не пакінут без увагі ГПК. Тут добра папрацавалі студэнткі юрфака Люда Новікава і Аня Столяр. Яны сартавалі пісьмы, дапамагалі ў адрасоўцы розных дакументацый. Акрамя таго, члены ГПК заўсёды аказвалі пасільную дапамогу дзяржаўнай прыёмнай камісіі: правяралі расклад экзаменаў, рыхтавалі лісты для пісьмовых работ.

Пад кіраўніцтвам намесніка адказнага сакратара У. Т. Шалатоніна ГПК аформіла фотастэнд, які адлюстраваў ход уступных экзаменаў. Фотастэнд прыцягнуў вялікую ўвагу абітурыентаў, студэнтаў, выкладчыкаў.

Грамадская прыёмная камісія з пачаткам навучальнага года сваю работу не заканчвае, бо амаль у кожнай школе, на фабрыках, заводах, у калгасах і саўгасах нашай рэспублікі ёсць юнакі і дзяўчаты, якія мараць стаць студэнтамі БДУ. Клопат аб іх — галоўны клопат ГПК.

**Л. ГЕНІНА.**

**НА ЗДЫМКУ:** з чарговым наведвальнікам гутарыць Л. Рэдзькіна.

# КЛІЧУЦЬ КАЛГАСНЫЯ ПАЛІ

**Набліжаецца адказная пара — пара ад'езду на сельскагаспадарчыя работы. Вопыт мінулага года паказаў, што на факультэтах, дзе былі арганізаваны студэнцкія атрады, уборка бульбы прайшла найбольш паспяхова. Таму камітэт камсамола БДУ пастанавіў: арганізаваць на базе вучэбных груп студэнцкія будаўнічыя атрады, выбраць і зацвердзіць камандзіраў і камісараў, вывучыць кароткі курс тэхнікі бяспекі, вывучыць статут студэнцкага будаўнічага атрада.**

### ПАЛАЖЭННЕ

*аб сацыялістычным спаборніцтве студэнцкіх будаўнічых атрадаў, занятых на сельскагаспадарчых работах у верасні 1973 г.*

**1973 год — рашаючы год пяцігодкі. Хлебаробамі Беларусі вырашчан добры ўраджай. Сабраць яго без страт— галоўная задача. Вялікі атрад студэнтаў універсітэта ў верасні будзе заняты на сельскагаспадарчых работах.**

**Выконваючы пастанову ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб мерах па догляду за пасевамі, забеспячэнню уборкі ўраджаю і нарыхтовак сельскагаспадарчых прадуктаў у 1973 г.», камітэт камсамола універсітэта зацвердзіў палажэнне аб сацыялістычным спаборніцтве будаўнічых атрадаў на сельскагаспадарчых работах у верасні месяцы.**

**УМОВЫ СПАБОРНІЦТВА**

**I. Сацыялістычнае спаборніцтва прысвечана 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.**

**II. У сацыялістычным спаборніцтве прымаюць удзел СБА універсітэта.**

**III. Атрады, у якіх будуць парушэнні статута СБА, з сацыялістычнага спаборніцтва выбываюць.**

**ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ**

**1. Вынікі спаборніцтва падводзяцца да 15 кастрычніка 1973 г.**

**2. Асноўнымі крытэрыямі пры падвядзенні вынікаў з'яўляюцца:**

**а) выкананне норм выпрацоўкі, якасць выконваемых работ;**

**б) строгае падтрыманне правіл тэхнікі бяспекі, адсутнасць выпадкаў траўматызму;**

**в) пастаноўка культурна-масавай і грамадска-палітычнай работы сярод мясцовага насельніцтва;**

**г) аказанне дапамогі сельскай школе;**

**д) выпуск атрадных газет, баявых лісткоў, маланак і г. д.;**

**е) аказанне дапамогі сельскай моладзі ў падрыхтоўцы да здачы норм ГПА.**

**УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ**

**I. Атрады ўзнагароджваюцца:**

**за I месца — значкамі ЦК ВЛКСМ «Ударнік 1973», прэміруюцца паездкай у Брэсцкую крэпасць-герой і атрымліваюць вымпел РК ЛКСМБ;**

**за II і III месцы — граматамі рэктарата і бібліятэчкамі палітычнай літаратуры.**

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ.**

*НА СТУДЭНЦКІХ МЕРЫДЫЯНАХ*

# ТЫ Ў СЭРЦЫ МАІМ, ФЕСТЫВАЛЬ!

Фестываль... Зараз гэтае слова, напэўна, самае папулярнае на зямным шары. Яго разумеюць без перакладу, як разумеюць словы мір, дружба, салідарнасць. Дзесяты Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у сталіцы ГДР Берліне стаў знамянальнай вяхой на шляху мабілізацыі дэмакратычных сіл моладзі ў барацьбе за лепшае будучае чалавецтва.

Фундамент поспеху X фестывалю закладваўся ўжо ў перыяд перадфестывальнай падрыхтоўкі. Амаль у 130 краінах усіх кантынентаў былі створаны Нацыянальныя падрыхтоўчыя камітэты. Яны праводзілі масавыя кампаніі і акцыі салідарнасці, мітынгі, сустрэчы і дыскусіі па пытаннях, стаўшых у далейшым прадметам абмеркавання ў фестывальным Берліне.

Разам з камуністычнымі і другімі саюзамі моладзі ў фестывалі прымалі удзел сілы, традыцыйна стаяўшыя ўбаку ад фестывальнага руху і нават выступаўшыя ў мінулым з рэакцыйнымі ідэямі. Так, напрыклад, афіцыйным удзельнікам X фестывалю быў міжнародны саюз маладых сацыялістаў — МСМС. Як вядома, іменна МСМС у Вене і Хельсінкі выконваў неблагавідныя функцыі актыўнага арганізатара антыфестывальнай дзейнасці. У Берліне дэлегаты МСМС выступалі з рэалістычных пазіцый, выказваліся за далейшае развіццё супрацоўніцтва з саюзамі моладзі сацыялістычных краін.

Вялікую групу ўдзельнікаў фестывалю саставілі дэлегацыі рознага роду прафсаюзных, рэлігійных, буржуазна-ліберальных аб'яднанняў моладзі і студэнтаў. Некаторыя з іх спрабавалі выступаць з ідэйна-палітычнымі поглядамі, якія супярэчылі духу фестывалю. У час шчырых дыскусій яны павінны былі нярэдка прызнаваць памылковасць сваіх сцвярджэнняў, а часам проста аказваліся ў адзіноце.

У фестывальным Берліне знаходзіліся і правыя, антыфестывальныя сілы. Сярод іх асаблівай актыўнасцю вызначаліся прадстаўнікі «Маладога саюза» — маладзёжнай секцыі партыі ХДС-ХСС (ФРГ) і падобнага яму заходнегерманскага Саюза каталічнай моладзі. У новай абстаноўцы яны змянілі антыфестывальную палітыку, спалучаючы выпады з трыбуны асобных мерапрыемстваў з неафіцыйнымі дыскусіямі на вуліцах і плошчах Берліна. Тым не менш мадэрнізацыя тактычнага арсеналу правых сіл поспеху не мела. Усе іх правакацыйныя вылазкі аргументавана спыняліся. К правым сілам аб'ектыўна прымыкалі групіроўкі маладых трацкістаў і мааістаў, якія праніклі на фестываль у саставе шэрагу нацыянальных дэлегацый і па турысцкай лініі.

Такім чынам, ідэалагічныя супярэчнасці на X фестывалі мелі месца, але аб'ектыўныя ўмовы склаліся не ў карысць нашых ідэалагічных праціўнікаў. Бітву ідэй на фестывалі выйграла моладзь, якая прадстаўляла сілы прагрэсу і сацыялізму. Саюзы моладзі сацыялістычных краін, камуністычныя і рабочыя дэмакратычныя маладзёжныя арганізацыі капіталістычных краін, маладзёжныя аб'яднанні краін «трэцяга міру» дзейнічалі ў цесным кантакце і былі ў цэнтры ўвагі на ўсіх без выключэння фестывальных мерапрыемствах.

Усяго ў Сусветным фестывалі прынялі удзел 25646 пасланцоў моладзі са 140 краін свету. Яны прадстаўлялі ў Берліне 1.700 палітычных, прафсаюзных, спартыўных, турысцкіх і іншых арганізацый.

У якасці ганаровых гасцей можна было бачыць відных грамадскіх дзеячаў, вучоных, спартсменаў, майстроў культуры. Гэта — вядомы барэц за мір француженка Раймонда Дзьен, генерал арміі П. І. Батаў, мужная амерыканская патрыётка Анджэла Дэвіс, лётчык-касманаўт СССР В. У. Нікалаева - Церашкова, кубінскі паэт Нікалас Гільен, вядомы ўсяму свету А. П. Марэсьеў і многія іншыя.

Вялікі рэзананс сярод дэлегатаў атрымала пасланне Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева. Яно сведчыла аб высокай ацэнцы Савецкім Саюзам намаганняў моладзі свету, накіраваных на забеспячэнне міру і супрацоўніцтва.

Яркім і памятным было ўрачыстае адкрыццё фестывалю на стадыёне «Маладосць міру». Некалькі гадзін пад бурныя апладысменты ва ўрачыстым шэсці праходзілі дэлегаты. А калі на ўсланую дыванамі дарожку стадыёна ступілі савецкія дэлегаты і ўрачыста запалыхаў чырвоны сцяг Краіны Саветаў, здавалася, неба не вытрымае таго незвычайнага напалу авацый і радасці, якімі сустрэла моладзь свету савецкіх юнакоў і дзяўчат.

Ад нашай рэспублікі ў складзе савецкай дэлегацыі былі дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, слесар Брэсцкага электрамеханічнага завода Барыс Юзафовіч, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, механізатар з калгаса «Ясная паляна» Ашмянскага раёна Вітольд Грыц, кампазітар Ігар Лучанок, першы сакратар Гомельскага абкома камсамола Уладзімір Казлоўскі, вядомы токар з Брэста Леанід Дзяцел, свідравальшчыца з завода «Гомсельмаш» Валянціна Літвіненка і іншыя. Сцяг савецкай дэлегацыі нёс на фестывалі ганаровы алімпійскі чэмпіён, мінчанін Аляксандр Мядзведзь.

У фестывальным прэсцэнтры было акрэдытавана больш 1.500 журналістаў, прадстаўляўшых вядучыя органы друку і інфармацыі амаль 90 краін. Гэта яшчэ раз гаворыць аб тым, якую вялікую ўвагу ўдзяляе сусветная грамадскасць Сусветнаму форуму моладзі планеты.

У час фестывалю адбыліся сотні мітынгаў, сустрэч, семінараў, канферэнцый, прысвечаных самым актуальным пытанням барацьбы моладзі за антыімперыялістычную салідарнасць, мір, дружбу. Кожны дзень фестывалю быў прысвечан той ці іншай праблеме. Энтузіязм, масавасць, высокі палітычны напал дыскусій, у якіх прымалі удзел тысячы маладых людзей, адлюстроўвалі высокі ўзровень палітычнай сталасці і актыўнасці моладзі ў сучасным свеце. Моладзь стала адной з найбольш актыўных сіл сучаснасці. І сустрэча маладых людзей у Берліне, як дакладны барометр, адлюстроўвала палітычную тэмпературу на зямным шары, давала найбольш поўны яго малюнак. У цэнтры шматлікіх абмеркаванняў стаялі пытанні барацьбы за сацыяльна-эканамічныя правы моладзі супраць панавання манаполій, супраць духоўнага атручвання маладога пакалення і падаўлення дэмакратычных свабод.

Юнакі і дзяўчаты абмяркоўвалі праблемы раззбраення і ўрбанізацыі, дзяліліся вопытам рашэння нацыянальных і аграрных пытанняў, дыскуціравалі па пытаннях дэмаграфіі, футуралогіі, шукалі шляхі да ўмацавання супрацоўніцтва міжнародных і рэгіянальных арганізацый.

Не менш насычанымі і цікавымі былі культурная і спартыўная праграмы.

Члены дэлегацыі савецкай моладзі рабілі ўсё, каб унесці пачэсны ўклад у паспяховае правядзенне ўсіх фестывальных мерапрыемстваў. Мы ўдзельнічалі ва ўсіх без выключэння масавых палітычных маніфестацыях, мітынгах, праводзілі двухбаковыя сустрэчы і гутаркі з нацыянальнымі дэлегацыямі, выступалі на канферэнцыях, семінарах, сімпозіумах. Частка дэлегацыі выязджала ў іншыя гарады ГДР на сустрэчы з моладдзю. Фестываль выйшаў за межы Берліна, прайшоў па ўсёй тэрыторыі Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Цяжка перадаць словамі тыя пачуцці і думы, тое вялікае ўражанне, якое пакінуў у сэрцы кожнага яго ўдзельніка X Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Ды і не гэта галоўнае. Важна, што фестываль узняў і натхніў прагрэсіўную моладзь планеты на новыя поспехі ва ўмацаванні адзінства, згуртаванасці ў барацьбе супраць імперыялізму, за мір і сацыяльны прагрэс.

**Васіль ДРАГАВЕЦ,**
**студэнт, дэлегат X Сусветнага фестывалю.**

# У ПОЛЬСКІХ КАЛЕГ

Адпаведна з дагаворам, падпісаным у 1973 годзе, 18 студэнтаў-філолагаў (русістаў) з 28 чэрвеня па 22 жніўня знаходзіліся ў Кракаўскай вышэйшай педагагічнай школе.

Групу ўзначальвалі дацэнт факультэта В. А. Захарава і начальнік аддзела зарубежных сувязей БДУ С. С. Булычоў.

Пяць дзён нашы студэнты гасцілі ў Варшаве і грунтоўна знаёміліся са сталіцай, агледзелі помнікі мастацтва, палацы, наведалі могільнік савецкіх воінаў, дзе ля галоўнага п'едэстала паклалі прывезеную з сабой зямлю і ўсклалі свежыя ружы.

Пасля ўся група выехала ў старажытную сталіцу Польшчы — Кракаў. Асаблівае ўражанне выклікала наведанне ленінскіх мясцін — музея ў Кракаве і сяла Пароніна, дзе амаль два гады жылі У. І. Ленін і Н. К. Крупская.

Больш двух тыдняў студэнты БДУ правялі пад Кракавам у вучэбным моўным цэнтры. К нашаму прыезду польскія сябры накіравалі туды больш як 100 сваіх студэнтаў-русістаў, будучых выкладчыкаў. Нашы студэнты дапамаглі польскім сябрам практычна замацаваць веды па рускай мове, атрыманыя ў вышэйшай педагагічнай школе, паглыбіць іх, расшырыць лексіку, і ў першую чаргу лексіку бытавую, сачылі за правільным вымаўленнем.

У вучэбным лагеры панавала атмасфера сардэчнай дружбы і добрых таварыскіх адносін. Вечарамі наладжваліся сумесныя канцэрты самадзейнасці, вечары дружбы, літаратурныя віктарыны. Польскія студэнты выказалі сваім беларускім калегам сардэчную ўдзячнасць за аказаную дапамогу ў асваенні рускай мовы.

Пачатак новага навучальнага года 18 студэнтаў Кракаўскай вышэйшай педагагічнай школы сустрэнуць разам з нашымі філолагамі ў Мінску.

**Н. САКАЛОЎ.**

# ТВОЙ СЯБАР— БІБЛІЯТЭКА

Той, хто прыходзіць у вну, павінен адразу навучыцца працаваць з кнігай. Бо патрэбныя звесткі ў кожнай галіне ведаў — гэта бясконцы паток кніг, часопісаў, бюлетэняў, зборнікаў, якія выходзяць на розных мовах. Уменне арыентавацца ў гэтым патоку, хутка знайсці неабходную літаратуру —адна з важнейшых умоў паспяховай работы, вучобы, навуковай творчасці.

Сёння бібліятэка БДУ — навуковы і метадычны цэнтр. Яна карыстаецца папулярнасцю не толькі ва універсітэце, але і за яго межамі дзякуючы свайму універсальнаму фонду, які ўкамплектаван літаратурай у адпаведнасці з вучэбнымі планамі, планамі навукова-даследчай і палітыка-масавай работы факультэтаў.

Цяпер бібліятэка налічвае 1.135.440 тамоў і абслугоўвае 19.985 чытачоў. За год яны бяруць тут больш 1,5 мільёна экземпляраў розных выданняў. Штодзённа бібліятэку наведваюць каля 3000 чалавек.

Калектыў гэтага важнейшага падраздзялення пастаянна ўдасканальвае формы і метады абслугоўвання, развівае бібліяграфічную, масавую, інфармацыйную работу, вядзе шырокую прапаганду кнігі. У адказ на патрабаванні часу супрацоўнікі бібліятэкі мяняюць формы і метады работы з чытачамі, шукаюць і ўкараняюць больш эфектыўныя з іх. У пачатку гэтага года, напрыклад, мы перайшлі на дыферэнцыраванае абслугоўванне. Адпаведна змянілася і структура бібліятэкі. У ёй арганізаваны два абанементы: абанемент вучэбнай літаратуры (знаходзіцца на III паверсе галоўнага корпуса), які абслугоўвае студэнтаў дзённага, вячэрняга аддзяленняў і завочнага факультэта, і абанемент навуковай і мастацкай літаратуры (II паверх галоўнага корпуса), які абслугоўвае прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікаў і студэнтаў усіх аддзяленняў.

Запіс студэнтаў у бібліятэку арганізаван на вучэбным абанеменце. Кожны атрымлівае адзіны білет чытача, які дае права карыстацца літаратурай на двух абанементах і ва ўсіх чытальных залах. Дзве галіновыя студэнцкія чытальныя залы — № 3 (гуманітарных і грамадскіх навук) і № 4 (прыродазнаўчых і тэхнічных навук) размешчаны на трэцім і другім паверхах. Адкрыты доступ да кніжнага фонду ў чытальных залах дазваляе студэнтам непасрэдна ля кніжнай паліцы пазнаёміцца з літаратурай.

На другім паверсе размяшчаецца даведніцка-бібліяграфічны аддзел (уваход праз чытальную залу № 2, пакой 231). Тут знайсці патрэбную кнігу студэнту дапаможа даведніцка-бібліяграфічны апарат бібліятэкі —каталогі: алфавітны (III паверх, пакой 319) і сістэматычны (II паверх, пакой 223). Тут можна атрымаць і кваліфікаваныя кансультацыі бібліятэчных работнікаў. Знаёмства з каталогамі, картатэкамі, рознымі энцыклапедыямі, даведнікамі, бібліяграфічнымі ўказальнікамі намнога аблегчыць і паскорыць работу па падбору літаратуры пэўнай тэматыкі, дапаможа ўдакладніць аўтара або назву кнігі, артыкула.

Студэнтам, якія пачынаюць сваё ўзыходжанне да вяршынь навукі, жадаем быць вернымі сябрамі бібліятэкі, актыўнымі ўдзельнікамі ўсіх яе мерапрыемстваў. Прапануем разам з намі ўключацца ў работу ў новым навучальным годзе.

**Л. МІЦКЕВІЧ,**
**старшы бібліятэкар.**



*Анатоль ГРАЧАНКОЎ*

*Блакіт прадонны, вераснёвы,*
*Бярозак ціхамірны сум.*
*Плыву, плыву на бераг новы*
*Услед за вырамі дум.*

*Былі і ўзлёты і трывогі,*
*Асцюкаватыя часы,*
*Былі дняпроўскія парогі,*
*Былі палескія лясы.*

*І у падпалах дзень асенні,*
*І гэта ўспененая гаць,*
*І ўсе адценні іх і цені*
*За мной ляцяць, са мной*
*ляцяць.*

*І ціхім спевам адмысловым*
*Ліецца ў хісткі човен дум*
*Блакіт прадонны, вераснёвы,*
*Бярозак ціхамірны шум.*

Леанід АНОП

**АЛЕНІ**

Па жоўтых палянах
Бясшумна, як цені,
Зоры збіваючы, ходзяць
алені.
Лета шукаюць,
уздзеўшы на рогі,
Казкі лясныя,
самоту,
трывогі...
Дзе тут знайсці?
Мо падкажа ім
верасень?..
Ноч спіць на мяккім
Верасе...
Лісцем пажоўклым,
абветраным
Мокрым і дзіўным,
Падае восень
На цёплыя спіны.

# КАЛЯНДАР

## ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ

**1 верасня**—50 год з дня адкрыцця (1923) у Маскве І Усесаюзнага свята фізічнай культуры.

**2 верасня**—УСЕСАЮЗНЫ ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ НАФТАВАЙ І ГАЗАВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.

**2 верасня 1945 г.**—абвяшчэнне Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

**2 верасня 1945 г.**—падпісан акт аб безагаворачнай капітуляцыі Японіі.

**8 верасня**—МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ ЖУРНАЛІСТАЎ.

**9 верасня**—25 год з дня абвяшчэння (1948) Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

**9 верасня 1944 г.**—звяржэнне фашысцкай дыктатуры ў Балгарыі. Нацыянальнае свята балгарскага народа — Дзень свабоды.

**9 верасня**—145 год з дня нараджэння Л. М. Талстога (1828—1910).

**9 верасня**—ДЗЕНЬ ТАНКІСТАЎ.

**13 верасня**—50 год з дня нараджэння Зоі Касмадзям'янскай (1923—1941), савецкай партызанкі, Героя Савецкага Саюза.

**13 верасня**—30 год з дня (1943) Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза арганізатарам і кіраўнікам падпольнай камсамольскай арганізацыі «Маладая гвардыя».

**15 верасня**—100 год з дня смерці А. П. Федчанкі (1844—1873), рускага прыродазнаўцы і падарожніка.

**16 верасня**—ДЗЕНЬ РАБОТНІКА ЛЕСУ.

**24 верасня 1970 г.**—упершыню ў гісторыі асваення касмічнай прасторы месячны грунт быў дастаўлен на Зямлю з дапамогай вяртаемага апарата савецкай аўтаматычнай станцыі «Луна-16».

**25 верасня**—90 год назад (1883) была створана першая руская марксісцкая група «Вызваленне працы».

**27 верасня**—70 год з дня нараджэння В. З. Харужай (1903—1942), дзеяча рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі і Польшчы, савецкай партызанкі, Героя Савецкага Саюза.

**28 верасня**—200 год назад (1773) пачалася сялянская вайна пад кіраўніцтвам Е. І. Пугачова.

**30 верасня**—ДЗЕНЬ МАШЫНАБУДАЎНІКА.

# ЕЎДАКІМАЎ П. К.

Беларуская прававая навука панесла цяжкую страту. 22 жніўня 1973 года раптоўна памёр дацэнт кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва, член КПСС з 1946 года Пётр Канстанцінавіч ЕЎДАКІМАЎ.



П. К. Еўдакімаў нарадзіўся 12 ліпеня 1922 года ў вёсцы Касцюкоўка Шуляцкага раёна Смаленскай вобласці ў сям'і селяніна-бедняка.

Пасля заканчэння сярэдняй школы ён паступіў у Каспійскае вышэйшае ваенна-марское вучылішча і ў верасні 1941 года быў накіраван у Каспійскую Флатылію, дзе праслужыў да 1945 года.

З верасня 1945 года П. К. Еўдакімаў студэнт Мінскага юрыдычнага інстытута, пасля аспірант і ў далейшым выкладчык гэтага ж інстытута. З 1955 па 1959 год ён працуе ў апараце Мінскага абкома КПБ.

З 1959 года і да апошніх дзён свайго жыцця Пётр Канстанцінавіч працаваў на кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва БДУ.

Палітычна загартаваны педагог і навуковы работнік, ён быў аўтарам больш 20 работ па дзяржаўнаму і адміністрацыйнаму праву, а таксама па савецкаму будаўніцтву і навуцы кіравання.

Пётр Канстанцінавіч быў любімцам студэнтаў юрыдычнага факультэта, пастаянна кіраваў студэнцкім навуковым гуртком.

Разам з вучэбнай і навуковай працай П. К. Еўдакімаў многа часу ўдзяляў грамадскай рабоце. Ён неаднаразова быў выбран членам і сакратаром партбюро факультэта, членам парткома універсітэта. На працягу пяці год ён з'яўляўся рэктарам Мінскага гарадскога народнага універсітэта прававых ведаў. Быў членам навукова-кансультацыйнага савета пры Вярхоўным судзе БССР.

За актыўны ўдзел у грамадскай рабоце і прапагандзе прававых ведаў сярод насельніцтва горада Мінска і рэспублікі П. К. Еўдакімаў неаднаразова заахвочваўся.

Нястомны працаўнік і жыццялюб, ён вызначаўся выключна сяброўскімі адносінамі да таварышаў па рабоце і студэнтаў, быў гатоў у любую хвіліну аказаць ім дапамогу парадай і справай.

За заслугі перад Радзімай П. К. Еўдакімаў узнагароджан чатырма медалямі і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Светлы вобраз Пятра Канстанцінавіча Еўдакімава, педагога, вучонага, прывабнага чалавека назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Калектыў юрыдычнага факультэта.



*Цеплынёй, шчырай задушэўнасцю была прасякнута сустрэча студэнтаў, якія адпачывалі ў спартыўна-аздараўленчым лагеры на возеры Нарач, з піянерамі лагера «Зубронак».*

*Школьнікі ўручылі студэнтам памятныя значкі, а потым з новымі сябрамі зрабілі прагулку па возеру. Гэтыя моманты і адлюстраваў наш фотакарэспандэнт.*



# І СМЕХ І ГРЭХ

## З САЧЫНЕННЯЎ І ВУСНЫХ АДКАЗАЎ АБІТУРЫЕНТАЎ-73

● Всё более и более кулаки оскаливали зубы... Всё сильнее и сильнее крошились зубы кулаков, хотевших подгрызть эти устои.

● Интересы Давыдова и Половцева расходились по всем швам.

● Стихотворение Некрасова «Железная дорога», а также «О людях Кузнецкстроя» Маяковского прославляют беспримерный труд нашего советского народа.

● Тема Родины в «Мертвых душах» Гоголя раскрывается на образе Руси-тройки, которая сильно мчится, но не знает, где остановить свои копыта.

● Будут они (дети) сидеть так тихо, чтобы слышно было, как пролетит муха. Я их поблагодарю одними глазами, а они таким же образом скажут: «Пожалуйста».

● Счастье — это звучит здорово! Но какой ценой оно было завоевано и сколько человеческих жертв отдало за него свою жизнь.

● Могучие дубы русской литературы — Пушкин, Лермонтов, Толстой.

● Каждый человек верил в оптимизм.

● Медленно начинают отживать страницы книг.

● Глубоко зеркальные по содержанию слова Есенина отражают мысли каждого настоящего человека.

● У Ленского виден ум, хотя он окончил в Германии университет.

● На примере матери Горький показал, что человек должен жить не только для себя, а для общества в первую очередь. Очень хорошо написал он об этом в поэме «Сердце Данко».

● И в настоящее время роман «Мать» переведен более чем на **пятьсот** языков мира.

● Все произведения А. П. Чехова подёрнуты плёнкой юмора в обличении мещанства.

● Здесь опять проходит сравнение А. Болконского с дубом, но уже летним.

● Основоположник социалистического реализма — А. С. Пушкин.

● Поэма Маяковского «Хорошо» написана в 1602 году.

### *АБІТУРЫЕНЦКІЯ НЕАЛАГІЗМЫ*

Руководительство, одиночески (вм. одиноко), показание (вм. показ), таджики и украины, огрызание (уходящего строя), многоразвитость, смекалкость, буреписатель, устносказание, смирительная девушка, изнеможденный, созидатель и творитель, обывательство, пожилые (вм. жилые) дома, экскопаемые (т. е. ископаемые), предтворять.

**Сабраў П. П. ШУБА, старшыня прадметнай экзаменацыйнай камісіі па рускай мове і літаратуры.**

# НОВЫЯ КНІГІ

## ПА ЭКАНОМІЦЫ, ЯКІЯ ПАСТУПІЛІ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ Ў ЖНІЎНІ

1. Белович, А. Планирование и финансирование капитальных вложений в странах—членах СЭВ. М., «Экономика», 1973.
2. Залкинд, А. И. и Кудрова, Е. С. Статистика цен в европейских социалистических странах. М., «Статистика», 1973.
3. Золотарев, В. И. Программа экономического сотрудничества социалистических стран. М., «Междунар. отношения», 1973.
4. Казаченок, А. Г. Проблемы производительности труда. Минск, «Наука и техника», 1973.
5. Крушевский, А. В. и др. Экономико-математические модели в планировании и управлении народным хозяйством. (Учеб. пособие для экон. и мат. специальностей вузов). Киев, «Вища школа», 1973.
6. Левин, А. И. Социалистический внутренний рынок. (Закономерности и проблемы развития). М., «Мысль», 1973.
7. Мариан, Г. Экономическая интеграция стран социализма. Пер. с польск. М., «Экономика», 1973.
8. Новое в планировании и управлении народным хозяйством в СРР. Сборник материалов. Пер. с румынского. Под общ. ред. Л. С. Мосина. М., «Прогресс», 1973.
9. Социально-экономические проблемы использования рабочей силы. М., «Мысль», 1973.
10. Теории экономического роста развивающихся стран Азии. Сборник статей. М., «Наука», 1973.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19. Зак. 987.
АТ 07374 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Газета выходзіць на беларускай мове, па чацвяргах.